**УДК 325.1 (476-15)(091) "19"**

# ЭТНАДЭМАГРАФІЧНЫЯ І МІГРАЦЫЙНЫЯ ПРАЦЭСЫ Ў ЗАХОДНЯЙ БЕЛАРУСІ НАПЯРЭДАДНІ ВЯЛІКАЙ АЙЧЫННАЙ ВАЙНЫ

***Д.А. Дзядзюля***

*Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт, пр. Незалежнасці, 4, 220030, г. Мінск, Беларусь, dariadedyulya@gmail.com*

Важную ролю ў жыцці беларускага грамадства адыгрываюць міграцыйныя працэсы. З пачаткам Другой сусветная вайны адбыліся кардынальныя змены ў аб'ёмах, інтэнсіўнасці і накіраванасці міграцыйных патокаў. На падставе аналізу вывучаных крыніц і навуковай літаратуры ў артыкуле разглядаюцца асноўныя міграцыйныя працэс на тэрыторыі Заходняй Беларусі

***Ключавыя словы:*** *Другая сусветная вайна; Заходняя Беларусь; міграцыйныя працэсы; бежанцы; дэпартацыя; эміграцыя; этнічны склад насельніцтва.*

# ЭТНОДЕМОГРАФИЧЕСКИЕ И МИГРАЦИОННЫЕ ПРОЦЕССЫ В ЗАПАДНОЙ БЕЛАРУСИ НАКАНУНЕ ВЕЛИКОЙ ОТЕЧЕСТВЕННОЙ ВОЙНЫ

***Д.А. Дедюля***

*Белорусский государственный университет, пр. Независимости, 4, 220030, г.Минск, Беларусь, dariadedyulya@gmail.com*

Важную роль в жизни белорусского общества играют миграционные процессы. С началом Второй мировой войны резко изменились объем, интенсивность и направление миграционных потоков. На основании анализа изученных источников и научной литературы в статье рассматриваются основные миграционные процессы в Западной Беларуси.

***Ключевые слова:*** *Вторая мировая война; Западная Беларусь; миграционные процессы; беженцы; депортация; эмиграция; этнический состав населения.*

# ETHNODEMOGRAPHIC AND MIGRATION PROCESSES IN WESTERN BELARUS ON THE EVE GREAT PATRIOTIC WAR

***D. Dedyulya***

*Belarusian State University, Niezaliežnasci Avenue, 4, 220030, Minsk, Republic of Belarus, dariadedyulya@gmail.com*

Migration processes play an important role in the life of the Belarusian society. With the outbreak of World War II, the volume, intensity and direction of migration flows changed dramatically. Based on the analysis of the studied sources and scientific literature, the article examines the main migration processes in Western Belarus.

***Key words:*** *World War II; Western Belarus; migration processes; refugees; deportation; emigration; ethnic composition of the population.*

У гісторыі Беларусі мінулага XX стагоддзя было нямала глабальных узрушэнняў. Адной з найбольш драматычных падзей, па прызнанні шматлікіх гісторыкаў, стала Савецка-польская вайна 1919–1920 гг., якая завяршылася 18 сакавіка 1921 г. падпісаннем ў Рызе мірнага дагавора. У адпаведнасці з умовамі Рыжскага мірнага дагавора паміж РСФСР і Украінай, з аднаго боку, і Польская Рэспублікай – з другога, беларуская нацыя і яе этнічная тэрыторыя аказаліся падзеленынымі на тры часткі. Амаль палова этнічнай тэрыторыі Беларусі адышла да Польскай Рэспублікі (II Рэчы Паспалітай), яшчэ адна частка была ўключана ў склад РСФСР (з 1922 г. – СССР). Такім чынам, падзел тэрыторыі Беларусі парушыў беларускую нацыянальную самасвядомасць і зрабіў Беларусь адным з асноўных «палёў напружанасці» ў польска-савецкіх адносінах у наступныя гады [12, с. 99].

У адпаведнасці з адміністрацыйна-тэрытарыяльным падзелам Польшчы заходнебеларускія землі былі падзелены на 29 паветаў, якія ўваходзілі ў склад 4 ваяводстваў: Беластоцкага, Навагрудскага, Палескага і Віленскага – гэта сучасныя Брэсцкая і Гродзенская поўнасцю і часткова Мінская і Віцебская вобласці (у азначаны перыяд – Навагрудскае ваяводства, Палескае ваяводства без Камень – Кашырскага, Сарненскага і часткі Пінскага і Столінскага паветаў, Гродзенскі, Ваўкавыскі і часткова Аўгустоўскі і Сакулкаўскі паветы Беластоцкага ваяводства, Ашмянскі, Браслаўскі, Вілейскі, Дзісненскі, Маладзечанскі, Пастаўскі і часткова

Свянцянскі паветы Віленскага ваяводства), што ў цэлым складала 29% усёй тэрыторыі Польскай Рэспублікі або 113 тыс. км² і 12,5% яго насельніцтва – 3,4 млн. чалавек (на 1921 г.), з іх толькі 1 млн. 34,6 тыс. беларусаў, а ў 1931 г. – 984,1 тыс. чалавек [1, с.12; 10, с. 11]. Аднак, дадзеныя афіцыйнай статыстыкі Польшчы патрабуюць верыфікацыі. Гэта звязана з некалькімі фактарамі: перш за ўсё з тым, што для павелічэння колькасці палякаў у іх склад наўмысна залічвалася значная частка беларусаў-католікаў і польскамоўных жыхароў; па-другое, людзі, якія мелі намер перайсці ў каталіцызм, фармальна застаючыся праваслаўнымі, маглі падчас перапісу 1921 г. дэклараваць польскую нацыянальнасць; па-трэцяе, у часткі насельніцтва Заходняй Беларусі былі праблемы з вызначэннем сваёй нацыянальнай прыналежнасці.

Варта адзначыць, что да цяперашняга часу ў беларускай і польскай гістарычнай навуцы не існуе адзінага пункту гледжання на конт дэмаграфічнай сітуацыі ў Заходняй Беларусі. Цяжкасць вызначэння этнічнага складу рэгіёну была абумоўлена недастатковасцю статыстычных дадзеных. Адным з шамтлікіх даследаванняў пры вызначэнні нацыянальнай структуры насельніцтва Заходняй Беларусі з'яўляецца аналіз этнічнай структуры на падставе дадзеных Другога ўсеагульнага перапісу насельніцтва польскага географа, прафесара Польскай акадэміі навук – Пятра Эберхардта. Паводле яго падлікаў, у 1931 г. сярод жыхароў Заходняй Беларусі палякаў было 1 млн. 351 тыс. чалавек (36%), беларусаў – 1 млн. 787,8 тыс. чалавек (47,6%), 283,3 тыс. яўрэяў (8,8%), 70,2 тыс. рускіх (2,2%), а таксама ўкраінцаў, літоўцаў, немцаў і інш. – 2,4% [15, с. 123]. Як бачна, найбольш шматлікімі былі тры этнасы: беларусы, палякі і яўрэі.

Частка сучасных беларускіх гісторыкаў, якая прытрымліваецца этнічнага прынцыпу вызначэння межаў Заходняй Беларусі, адносіць да яе толькі тыя землі, якія адышлі БССР пасля Другой сусветнай вайны (82.000. кв.км.). На іх думку, колькасць насельніцтва Заходняй Беларусі ў 1931 г. часцей за ўсё вызначаецца ў 4,6 млн. чалавек, дзе беларусы складалі 65%, а палякі 15% [5, с. 26].

Складанае эканамічнае становішча, нявырашаныя сацыяльныя праблемы і цяжкія ўмовы жыцця вымушалі жыхароў Заходняй Беларусі эміграваць у іншыя краіны і нават кантыненты. Польскія ўлады былі зацікаўлены ў эміграцыі як сродку аслаблення напружанасці ў

сацыяльна-эканамічным жыцці, грамадскапалітычнай сферы, для вырашэння яўрэйскага пытання [11, с.79]. Эміграцыя насельніцтва з Заходняй Беларусі ў 1921 – 1939 гг. ажыццяўлялася ў трох напрамках: еўрапейскім (краіны Еўропы), трансатлантычным (краіны Паўночнай і Паўднёвай Амерыкі), блізкаўсходнім (Палесціна) [4, с.12]. Па сведчанні афіцыйнай польскай статыстыкі, з 1927 да 1938 гады з Віленскага, Навагрудскага, Беластоцкага, Палескага ваяводстваў выехалі на пастаяннае месца жыхарства ў іншыя краіны 97,6 тыс. Чалавек [16, с. 54]. Такія лічбы тлумачацца тым, што адным з крытэрыяў для польскіх статыстаў пры аднясенні чалавека да той ці іншай нацыянальнай группы служыла веравызначэнне, таму хутчэй за ўсё, у вышэйзгаданых лічбах адлюстравана толькі колькасць праваслаўных і грэка-каталіцкіх грамадзян Польшчы. На думку беларускай даследчыцы Мярчук В.М., усяго на працягу 1926 – 1938 гг. з тэрыторыі чатырох ваяводстваў (Беластоцкага, Віленскага, Навагрудскага, Палескага) легальна выехала каля 212,5 тыс. чалавек з якіх 116,5 тыс. чалавек – у еўрапейскія краіны, 96 тыс. чалавек – у краіны Паўночнай і Паўднёвай Амерыкі, Палесціну. Значную частку еўрапейскай эміграцыі складала 16 сезонная сельскагаспадарчая міграцыя ў Латвію – 75,9 тыс. чалавек [4, с. 16].

Пачатак Другой сусветнай вайны стаў прычынай актыўных міграцыйных працэсаў на тэрыторыі Заходняй Беларусі. У 1939 – 1941 гадах на тэрыторыі Заходняй Беларусі праходзіла некалькі патокаў міграцыі. Першы склалі бежанцы ў асноўным яўрэйскай і ў меншай ступені польскай нацыянальнасці, якія рушылі з цэнтральных і заходніх раёнаў Польшчы і Літвы на ўсход краіны, у тым ліку на тэрыторыю Заходняй Украіны і Заходняй Беларусі [14, с. 66].

17 верасня 1939 г. Чырвоная Армія перайшла савецка-польскую мяжу і пачала ваенную аперацыю, што прывяло да другога патоку міграцыі. Большасць польскіх бежанцаў кінулася з Заходняй Беларусі на тэрыторыю, занятую Нямеччынай, а некаторая частка – у Румынію і Літву. Аднак і бежанцаў, якія засталіся ў заходніх абласцях Беларусі, было дастаткова для таго, каб значна павялічыць колькасць насельніцтва рэгіёну [14, с. 66].

Адразу пасля далучэння новай тэрыторыі органамі мясцовай адміністрацыі і прадстаўнікамі Чырвонай Арміі праводзіўся маніторынг нацыянальнага складу насельніцтва. У даведцы аб палітыка-эканамічным

стане ваяводстваў Заходняй Беларусі, складзенай у кастрычніку 1939 г., паказвалася, што палякі складаюць 72% у Беластоцкім ваяводстве, 59,9% – у Віленскім, 52,6% – у Навагрудскім, 14,5% – у Палескім; беларусы – 11,1%, 24,2%, 33,0% і 46,6%, адпаведна [5, с.29]. Інакш кажучы, у сярэднім у чатырох ваяводствах, прылічаных да Заходняй Беларусі, палякі налічвалі 49,8%, а беларусы – 28,7%. Апроч іх, тут пражывалі 4,4% літоўцаў, 9% яўрэяў, 7,43% украінцаў і іншыя нацыянальнасці. Паводле дадзеных сучасных гарадзенскіх даследчыкаў, да БССР ў 1939 годзе адышлі тэрыторыі з насельніцтвам 4 908 200 чалавек, на якіх палякі складалі 43% (2 110 500 чалавек), беларусы – 42% (2 061 400). Такім чынам, колькасць беларусаў і палякаў была прыкладна роўнай [5, с. 30].

З першага дня перад новай адміністрацыяй паўстала мноства самых разнастайных пытанняў. Неабходна было прымаць меры па перасяленню бежанцаў з Заходняй Беларусі, т.я. яны стваралі цяжкасці для населеных пунктаў у местах іх канцэнтрацыі. 21 кастрычніка 1939 г. Часовае абласное ўпраўленне абавязвала ўсіх старшыняў Часовых упраўленняў паветаў у трохдзённы тэрмін правесці ўлік усіх бежанцаў [12, л. 1]. Для гэтага яны павінны былі з'явіцца з асабістымі дакументамі для рэгістрацыі ў памяшканне Часовых упраўленняў, але на самой справе многія так і не прыходзілі на рэгістрацыю. Вось тыповая карціна, якая назіралася ў памежных гарадах Заходняй Беларусі пры канцы 1939 г. «... Бежанцаў так шмат, што ўсе вакзалы буйных гарадоў занятыя імі. У Беластоку ўвесь вакзал заняты імі. Цэлыя сем'і з малымі дзецьмі па некалькі сутак сядзяць на вакзале. У адной сінагозе знаходзіцца 5 тысяч бежанцаў. Жывуць у жудасных антысанітарных умовах, у цягніках поўна бежанцаў. У горадзе Беластоку на таўкучцы прадаюць адзенне і іншыя асабістыя рэчы, купляюць прадукты харчавання ... » – адзначалася ў дакладной запісцы Пракаповіча да ЦК КП (б) Б [14, с. 69].

Перасяленне бежанцаў ішло двума хвалямі: напрыканцы 1939 года (добраахвотнае) і ў 1940 году (прымусовае). Так, напрыклад, Ваенны савет Беларускага фронту чакаў прадастаўлення да 15 кастрычніка 1939 г. у штаб фронту (гор. Ваўкавыск) спісаў тых бежанцаў, хто прыйшоў з тэрыторыі занятай часткамі нямецкая арміі і жадаючых перасяліцца на Далёкі Усход [7, л.58]. Яшчэ да афіцыйнага далучэння Заходняй Беларусі да СССР з'явілася сакрэтная пастанова Савета народных камісараў СССР

ад 16 кастрычніка 1939 года «Аб размяшчэнні 20 000 бежанцаў рабочых, сялян і інтэлігенцыі на торфараспрацоўцы, будоўлях і іншых падобных прадпрыемствах БССР». Згодна з гэтай пастановай за перыяд з 25 кастрычніка па 14 лістапада 1939 года з Заходняй Беларусі ва ўсходнія вобласці Беларускай ССР быў перапраўлены 22 471 бежанец [2, с.164 – 165]. Усіх іх працаўладкавалі, а многіх вербавалі на працы на Урал, Данбас, у Сярэднюю Азію, на Каўказ і ва Ўсходнюю Сібір. Умовы працы аказаліся цяжкімі, жыллёвыя ўмовы таксама, а заробак нізкім. Таму да 7 лютага 1940 г. у Заходнюю Беларусь вярнулася каля 4,3 тыс. бежанцаў [2, с. 165].

Паводле рапарту Л. Цанавы ад 5 лютага 1940 г. на тэрыторыі Беларускай ССР жылі 72 996 бежанцаў (з іх 65 796 яўрэяў). Рэальная колькасць бежанцаў была больш, бо не ўсе яны рэгістраваліся, і перавышала 120 тыс. чалавек [2, с.30].

Для вырашэння праблемы бежанцаў 29 чэрвеня 1940 г. была праведзена аперацыя па іх высяленню ва ўсходнія і паўночныя раёны СССР, у выніку якой у цягнікі былі пагружаныя 7 224 сям'і (усяго 22 879 чалавек). Астатніх партыямі адпраўлялі пазней [3, с. 303].

Для арганізацыі працы па фарміраванні новых органаў савецкай улады на тэрыторыю Заходняй Беларусі былі камандзіраваныя партыйныя работнікі – «усходнікі». Так, напрыклад, паводле звестак пра агульную колькасць камандзіраваных савецкіх работнікаў, праз год пасля далучэння да БССР (кастрычнік 1940 г.), толькі ў Беластоцкую вобласць за год было накіравана ўсяго 12396 «усходнікаў» [2, с.82]. Кадравая палітыка савецкай улады заключалася ў тым, каб правераныя і палітычна добранадзейных людзі ўзначалілі найбольш важныя ўстановы і прадпрыемствы. Нярэдка бывала, што добранадзейнасць замяняла работніку кампетэнтнасць. Каб кадравая сітуацыя была больш збалансаванай, важнае значэнне надавалася вылучэнню мясцовых кадраў у апарат кіравання, судовыя, сілавыя органы, гандлёвыя, прамысловыя і фінансавыя структуры [9, с.51]. Пры накіраванні работнікаў у заходнія вобласці БССР савецкі ўрад імкнуўся выканаць нацыянальны баланс. Згодна з прынцыпам палітыкі карэнізацыі пры прызначэнні на пасаду ў адміністрацыйныя ўстановы перавага давалася беларусам.

Як асобную з’яву неабходна вылучыць палітычную эміграцыю насельніцтва. Пасля заканчэння польскай кампаніі ў Заходняй Беларусі

органамі НКУС была праведзена рэгістрацыя і ўлік затрыманых салдат і афіцэраў польскай арміі і іншых грамадзян Польшчы. Затым яны былі перададзеныя ў распараджэнне Упраўлення НКУС па справах ваеннапалонных і інтэрніраваных, створанага 19 верасня 1939 г. Па дакументам НКУС ад 19 лістапада 1939 г., у лагерах НКУС лічылася 125 тыс. чалавек. З іх было адпраўлена ў Заходнюю Украіну і Заходнюю Беларусь 42.400 чалавек [6, с. 309].

У мэтах папярэджання шырокай хвалі антысавецкіх выступленняў органы бяспекі паралельна праводзілі буйныя мерапрыемствы па дэпартацыі некаторых груп насельніцтва. Дэпартацыі падлягалі такія «сацыяльна-чуждыя элементы» як польскія афіцэры, паліцыянты, чыноўнікі, удзельнікі антысавецкага польскага падполля, асаднікі, работнікі ў лясной і вартавой ахове, прастытуткі. Фактычна першай і найбольш масавай дэпартацыяй на тэрыторыі Заходняй Беларусі была праведзена акцыя па высяленні асаднікаў і работнікаў лясной аховы. У адпаведнасці з дакладной запіскай народнага камісара ўнутраных спраў БССР Л. Цанавы аперацыя пачалася 10 лютага 1940 г. У гэты дзень было дэпартавана 9 584 гаспадарак з агульнай колькасцю 50 224 чалавек [8, с.78].

У хуткім часе былі падрыхтаваныя новыя мерапрыемствы па перасяленні жыхароў. 9 красавіка 1940 г. па Брэсцкай вобласці была праведзена работа па высяленню прастытутак. 13 красавіка 1940 г. высяленню падлягалі ваеннапалонныя афіцэры, паліцыянты і рэпрэсаваныя сем'і [7, л.58 – 59]. На падставе СНК СССР ад 2 сакавіка 1940 года «Аб ахове дзяржаўнай мяжы ў заходніх абласцях БССР і УССР» прадугледжвалася адсяленне жыхароў вёсак, якія пражывалі ўздоўж заходняй савецкай мяжы. Асноўную частку – 5 829 двароў – перасялялі на пэўную адлегласць ад сваіх вёсак у вызваленыя дамы ад асаднікаў і леснікоў [3, с.303 – 304].

Такім чынам, ва ўмовах сацыяльна-эканамічнай напружанасці ў верасні 1939 г. пачаўся працэс тэрытарыяльнай і этнаграфічнай кансалідацыі беларускай нацыі. На тэрыторыі Заходняй Беларусі напярэдадні Вялікай Айчыннай вайны праходзілі масавыя ўнутраныя і знешнія міграцыйныя працэсы. У выніку польская прысутнасць, якая пераважала да 1939 г. у заходняй частцы Беларусі змянілася ўзмацненнем беларускай і рускай. Пачаўся інтэнсіўны міграцыйны прыток, перш за

ўсё, рускіх вайскоўцаў і партыйных работнікаў, што стварала іншую сацыякультурную і этнічную рэальнасць. Аднак, кадравая і нацыянальная палітыка савецкага кіраўніцтва была накіравана на наданне заходняму рэгіёну этнічнага беларускага аблічча.

## Бібліяграфічныя спасылкі


1. *Вабішчэвіч А.М.* Нацыянальна-культурнае жыццё Заходняй Беларусі (1921–1939 гг.) / Брэсц. дзярж. ун-т імя А.С. Пушкіна. Брэст: Выдавецтва БрДУ, 2008.

2. *Карпенкина Я. В.* Советизация еврейского населения Западной Белоруссии (1939–1941 гг.): дисс…канд. ист. наук: 07.00.02 / Я.В. Карпенкина; НИУ ВШЭ. М., 2018.

3. *Костюк М. П.* «Советизация» Западной Беларуси в предвоенные годы // Восень 1939 года ў гістарычным лёсе Беларусі: Міжнародныя навукова-практычная канферэнцыя: матэрыялы. Мінск: Бел. навука, 2010. С. 297–309.

4. *Мярчук В. М.* Эміграцыя насельніцтва з Заходняй Беларусі (1921–1939 гг.): аўтарэф. дыс. ... канд. гіст. навук: 07.00.02 / В.М. Мярчук; Нац. акад. навук Беларусі, Ін-т гісторыі. Брэст, 2016.

5. *Петровская О.* Формирование границ Западной Белоруссии в 1939–1940 гг. // Журнал российских и восточноевропейских исторических исследований. Т. 1. № 1 (4). 2012. С. 24–41.

6. Польша в XX веке: очерки политической истории / [Крисань М. А. и др.]; Российская акад. наук, Ин-т славяноведения. М.: Индрик, 2012.

7. Протокол №1 первой Брестской областной конференции КП(Б)Б // Государственный архив Брестской области (ГАБО). Ф. 1п. Оп. 1б. Д. 3. Л. 58–59.

8. Рижский мир в судьбе белорусского народа. 1921–1953 гг. Кн. 2 / Нац. акад. наук Беларуси, Ин-т истории / редкол.: А.А. Коваленя [и др.]. Минск: Беларуская навука, 2014.

9. *Розенблат Е.С.* Западные области Белоруссии в 1939–1941 годах: оккупация – воссоединение – советизация // Западная Белоруссия и Западная Украина в 1939-1941 гг.: люди, события, документы. СПб.: Алетейя, 2011. С. 42–61.

10. *Сорокин, А. А.* Аграрный вопрос в Западной Белоруссии. 1920–1939 гг. Минск: [Наука и техника], 1968. С. 11–13.

11. *Стрелец М. В., Билевич О. И.* Общественно-политическая и культурная деятельность белорусской эмиграции в 1918–1939 гг. // Гуманитарные и юридические исследования. 2015. № 1. С. 78–79.

12. Телеграмма всем председателям Временных уездных управлений Полесской области // ГАБО. – Ф. 292. Оп. 1. Д. 3. Л. 1–3.

13. *Тихомиров А. В.* Фактор Беларуси в процессе советско-польского мирного урегулирования 1920–1921 гг. // Российские и славянские исследования: науч. сб. / Белорус. гос. ун–т.; Минск, 2008. С. 93–100.

14. *Толочко Д. М.* Проблема еврейских беженцев из Польши в советско-германских отношениях (сентябрь 1939 – июнь 1941 гг.) // Актуальные проблемы германской истории, политики, экономики, культуры: материалы III международной научной конференции. Брест, 2007. С. 66–71.

15. *Эберхард П.* Дэмаграфічная сітуацыя на Беларусі: 1897–1989 / Пад. рэд. У. Люкевіча. Брэст: Belfort, Беларускі Фонд Сораса, 1997.

16. Mały rocznik statystyczny. Warszawa: Glówny urzęd statystyczny Rzeczypospolitej Polskiej, 1939.